***Г. М. Канцавая***
загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ У СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Сучасныя тэндэнцыі развіцця вышэйшай адукацыі абумоўліваюць неабходнасць падрыхтоўкі канкурэнтаздольнага, прафесійна кампетэнтнага спецыяліста, які адказвае сучасным патрабаванням грамадства. «Галоўным недахопам падрыхтоўкі сённяшніх выпускнікоў, – падкрэслівае В.А. Абдуліна, – з‘яўляецца разрыў паміж тэарэтычнымі ведамі і навыкамі іх практычнага выкарыстання» [1, с. 34]. Сістэма прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў накіравана не на фарміраванне прафесійнай дзейнасці студэнтаў, а на засваенне імі пэўнай сукупнасці ведаў і ўменняў. У выніку тая дзейнасць, да выканання якой рыхтуюцца студэнты, распадаецца для іх на шэраг слаба звязаных паміж сабою нефункцыянальных уменняў, практычна несуадносных з кантэкстам іх будучай працы.

Да сённяшняга дня ў вышэйшай адукацыі пераважаюць лекцыі, кантроль за самастойнай працай на заліках і экзаменах накіраваны на ўзнаўленне ведаў, на дзяржаўным экзамене правяраецца ў асноўным не ўзровень сфарміраванасці прафесійных кампетэнцый, а, як правіла, памяць і ўменне ўзнавіць пачутае ці прачытанае. Зразумела, што пры такіх умовах нельга забяспечыць якасную адукацыю будучых настаўнікаў, неабходную ім для працы ў школе. Улічваючы сучасныя патрабаванні, выкладчыкі кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання БрДУ імя А.С. Пушкіна актыўна перабудоўваюцца на інавацыйна арыентаваную прафесійную адукацыю, якая накіравана на забеспячэнне кампетэнтнаснага падыходу, узаемасувязь акадэмічных ведаў і практычных уменняў. На пасяджэннях кафедры, навукова-метадычных семінарах абмяркоўваюцца магчымасці выкарыстання інавацыйных метадаў у навучанні студэнтаў, выкладчыкі дзеляцца практычным вопытам працы. Распрацоўваючы новыя падыходы да падрыхтоўкі педагагічных кадраў у ВНУ, выкладчыкі кафедры ўкараняюць у адукацыйны працэс метады інтэрактыўнага навучання, якія накіраваны на павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў пачатковых класаў. У працэсе падрыхтоўкі будучых спецыялістаў выкарыстоўваюцца такія метады і прыёмы, як правядзенне інтэрактыўных праблемных лекцый; правядзенне кароткіх прэзентацый, падрыхтаваных студэнтамі, якія раскрываюць адно з пытанняў тэмы; укараненне ў ходзе практычных заняткаў такіх формаў працы, як «круглы стол», «майстэрня», дзе студэнты ў працэсе абмеркавання рашаюць важныя праб-
лемы на аснове ўласных самастойных напрацовак; правядзенне дыспутаў, дыскусій, аналіз педагагічных сітуацый, відэафрагментаў урокаў;

выкарыстанне ў адукацыйным працэсе ролевых гульняў, кейс-метаду, «мазгавога штурму», якія садзейнічаюць развіццю актыўнасці, крэатыўнасці будучых педагогаў; правядзенне семінараў-практыкумаў, майстар-класаў, якія спрыяюць фарміраванню прафесійнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў пачатковых класаў; шырокае выкарыстанне электронных адукацыйных рэсурсаў, мультымедыйных сродкаў у працэсе чытання лекцый, правядзення практычных і лабараторных заняткаў; выкарыстанне новых падыходаў да кантролю і ацэньвання дасягненняў студэнтаў, якія забяспечваюць іх аб‘ектыўнасць і надзейнасць.

Метады актыўнага навучання садзейнічаюць фарміраванню ведаў, прафесійных уменняў і навыкаў будучых спецыялістаў шляхам далучэння іх да інтэнсіўнай пазнавальнай дзейнасці, актывізацыі мыслення ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, самастойнага прыняцця рашэнняў ва ўмовах павышанай матывацыі, узаемасувязі выкладчыка і студэнта і інш. Распаўсюджаны ў адукацыйным працэсе групавыя формы працы са студэнтамі, выкарыстанне якіх спрыяе больш хуткаму рашэнню студэнтамі метадычных задач, стварэнню спрыяльных умоў для вучэбнай камунікацыі, фарміраванню навыкаў арганізатарскай працы, рэфлексіўных здольнасцяў студэнтаў. Эфектыўнасць групавых формаў працы ўзрастае пры выкананні студэнтамі практычных работ, заданняў праблемнага характару, living рознага роду праектаў, правядзенні навукова-метадычных даследаванняў. Выкладчык пры гэтым толькі суправаджае, кантралюе адукацыйны працэс, даючы магчымасць студэнтам самастойна назапашваць веды шляхам рашэння праблемных задач. Мэтазгоднасць выкарыстання гэтага метаду ў падрыхтоўцы настаўніка пачатковых класаў прадыктавана і тым, што ён шырока распаўсюджаны ў практыцы пачатковай школы, так як уключае ў сябе разнастайныя формы навучання, арганічнае спалучэнне вучэбнага, займальнага і гульнявога матэрыялу.

Сродкам павышэння прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў з’яўляецца выкарыстанне ў адукацыйным працэсе і такіх практыкаарыентаваных формаў і метадаў навучання, як мадэляванне фрагментаў будучай прафесійнай дзейнасці, аналіз праблемных сітуацый, рашэнне метадычных задач на занятках па методыках выкладання прадметаў пачатковай школы і інш.

Распрацоўка і ўкараненне ў адукацыйны працэс дысцыплін па выбары, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесійна-педагагічнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў пачатковых класаў, накіравана на развіццё ў студэнтаў адносін да сябе як суб‘екта прафесійнай адукацыі, стварэнне ўмоў для самаадукацыі, фарміраванне ў будучых настаўнікаў уменняў і навыкаў самастойнай працы і самакантролю сваіх дасягненняў.

У аспекце ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў важнай з’яўляецца праблема інтэгратыўнасці курсаў: вывучыўшы прадметныя дысцыпліны (напрыклад, беларускую, рускую мовы, матэматыку), студэнт павінен мець уяўленне пра змест а дпаведнага

прадмета, які вывучаецца ў пачатковай школе. Прафесійна-педагагічная накіраванасць павінна пранізваць увесь адукацыйны працэс у ВНУ, у тым ліку адлюстроўвацца ў вучэбна-метадычных комплексах і дапаможніках.

Адным з найважнейшых шляхоў удасканалення прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў з'яўляецца павышэнне ўзроўню тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі да інавацыйнай дзейнасці ў школе, якая прадугледжвае сфарміраванасць творчага, індывідуальнага стылю. У сувязі з гэтым асобае месца ў адукацыйным працэсе ВНУ займае развіццё ў студэнтаў даследчых і творчых уменняў. Менавіта гэта праца дазваляе сфарміраваць у будучых настаўнікаў уменне бачыць новае ў тэорыі і практыцы сучаснай пачатковай школы, шукаць нестандартныя рашэнні праблем, якія стаяць перад школай, і даводзіць іх да этапа рэалізацыі. Сістэма арганізацыі такой працы патрабуе паэтапнасці, а таксама змяшчэнне акцэнту з фарміравання даследчых уменняў пры напісанні курсавых і дыпломных прац на ўдзел студэнтаў у даследчай дзейнасці пры вывучэнні дысцыплін вучэбнага плана, выкананні навукова-даследчых і творчых праектаў.

Яшчэ адна праблема падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў звязана з фарміраваннем у студэнтаў умення самастойна вучыцца. Адным са сродкаў рашэння гэтай праблемы з'яўляюцца вучэбна-метадычныя комплексы дысцыплін, электронныя адукацыйныя рэсурсы, якія ўключаюць у сябе сістэму самастойнай працы студэнта па дысцыпліне, а таксама заданні для самакантролю, бягучага і выніковага кантролю.

Практыкаарыентаваная падрыхтоўка студэнтаў патрабуе прынцыпова іншай арганізацыі педагагічных практык. Можна вылучыць кола асноўных праблем, звязаных з іх арганізацыяй: недастатковая колькасць гадзін, адведзеных на практыку ў вучэбных планах; у нагрузцы выкладчыкаў недастатковая колькасць гадзін адведзена на кіраўніцтва практыкай; нізкая дасведчанасць настаўнікаў аб канкрэтных мэтах і задачах практыкі і недасканаласць іх падрыхтаванасці да працы са студэнтамі ў плане развіцця прафесійных кампетэнцый, няўзгодненасць тэарэтычнай падрыхтоўкі ў ВНУ і школьнай практыкі. Пераадоленне вышэйпералічаных праблем бачыцца ў цесным супрацоўніцтве вышэйшай і пачатковай школ. Відавочна, што задача фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых настаўнікаў пачатковых класаў не можа рашацца толькі ў сценах ВНУ і сіламі толькі выкладчыкаў. Школа як асноўны заказчык новага настаўніка павінна далучацца да працэсу прафесійнай падрыхтоўкі студэнта. Важная роля ва ўмацаванні сувязяў кафедры са школай, стварэнні неабходных умоў для падрыхтоўкі кваліфікаваных настаўнікаў пачатковых класаў, узмацненні практычнай накіраванасці падрыхтоўкі спецыялістаў належыць створанаму на базе ДУА «Сярэдняя школа № 13 імя В. І. Хована г. Брэста» філіялу кафедры, які паступова становіцца лабараторыяй навукова-педагагічнага пошуку, мэтай дзейнасці якой з'яўляецца лагічны пераход адукацыйнага працэсу з

аўдыторыі ў школьны клас. Тут неабходна гаварыць пра ўдасканаленне арганізацыйна-метадычнага складніку мадэрнізацыі педагагічнай адукацыі. У

гэтым накірунку кафедра агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання мае дастатковы вопыт працы, актыўна ўзаемадзейнічаючы з адукайнымі ўстановамі Брэста і Брэсцкай вобласці. З мэтай плённага супрацоўніцтва і сатворчасці выкладчыкаў ВНУ, настаўнікаў-практыкаў, студэнтаў кафедрай арганізуюцца і праводзяцца навукова-метадычныя семінары, круглыя сталы, майстар-класы. Тэматыка мерапрыемстваў адлюстроўвае найбольш актуальныя пытанні тэорыі і методыкі пачатковай адукацыі. З мэтай выяўлення і падтрымкі адораных студэнтаў кафедра праводзіць конкурс вучэбна-метадычных распрацовак «Сучасны ўрок», арганізуе сустрэчы студэнтаў з выпускнікамі факультэта ў форме педагагічнай гасцёўні, якая з’яўляецца асобым фарматам зносін, што садзейнічае актывізацыі прафесійнага супрацоўніцтва вучоных, педагогаў-практыкаў і студэнтаў. Галоўная мэта такіх сустрэч – паказаць перспектывы прафесіі настаўніка, дапамагчы студэнтам вызначыцца з выбарам накірунку, у якім яны хацелі б знайсці сябе ў прафесійнай дзейнасці.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя тэндэнцыі ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў у ВНУ на сучасным этапе: выкарыстанне інтэрактыўных формаў навучання студэнтаў, інтэгратыўнасць зместу вучэбных курсаў, выкарыстанне практыкаарыентаваных формаў і метадаў навучання, рэфармаванне педагагічнай практыкі, укараненне ў адукацыйны працэс дысцыплін па выбары студэнтаў, павышэнне ўзроўню тэарэтычнай і практычнай падрытоўкі студэнтаў да інавацыйнай дзейнасці ў школе, удасканаленне арганізацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу.

*Спіс літаратуры*

1. Абдулина, О. А. Педагогическая практика студентов : учеб. пособие / О. А. Абдулина, Н. Н. Загрязнина. – М. : Просвещение, 2009. – 175 с.